Таццяна Захарава



Загадчык сектара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

# 15 яскравых рарытэтаў




1 верасня 2021 г. Музей кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі святкуе 15-годдзе дзейнасці. Музей кнігі – знакавая экспазіцыйная прастора, якая з'явілася ў новым будынку галоўнай бібліятэкі краіны ў 2006 г. За час сваёй працы ён стаў яркай візітоўкай Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. З нагоды юбілею ў Музеі кнігі створана выстава «5 + 5 + 5».

У межах экспазіцыі «5+5+5» прадстаўлены: 5 рукапісаў, 5 старадрукаваных і 5 рэдкіх выданняў – 15 сапраўдных рарытэтаў з фондаў бібліятэкі, якія выключна рэдка пакідаюць фондасховішча.

У першую пяцёрку ўвайшлі ўнікальныя рукапісныя помнікі: ад самых старажытных да самых рэдкіх і незвычайных кніг з калекцыі бібліятэкі.

Дэманструецца «Мінея службовая» (70-я гг. XV ст.) – найбольш старажытны рукапісны помнік беларускага паходжання ў зборы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Багаслужэбная кніга праваслаўнай царквы ўтрымлівае службы на кожны дзень месяца снежня святым, а таксама на Гасподні і Багародзічныя святы. Напісана паўуставам у два слупкі. Кніга рэстаўрыравалася ў XVII ст., калі і займела новы пераплёт, а таксама частку новых старонак з узноўленым тэкстам. Цікава, што рэстаўратар імкнуўся стылізаваць пісьмо адноўленага фрагмента пад почырк арыгінальнай часткі рукапісу. Кніга захоўвалася ў зборах куцеінскага Успенскага пад Оршай і баркалабаўскага Узнясенскага дзявочых манастыроў.

Другая з пяцёркі рукапісных кніг – «Тайная тайных, або Арыстоцелевы вароты» (XVI ст.). Зборнік складаецца з твора перакладной беларускай літаратуры 3-й чвэрці XVI ст. «Арыстоцелевы вароты», а таксама з падборкі артыкулаў, якія прысвечаны варажбе, прадказанням і ўтрымліваюць астралагічныя даныя і табліцы. Напісаны паўуставам. Мае шматлікія паметы на палях, зробленыя рознымі почыркамі ў XVI–XVIII стст., якія сведчаць пра папулярнасць зборніка. Мова і пісьмо рукапісу, чытацкіх памет указваюць на тое, што ён быў створаны і бытаваў на беларускіх землях Вялікага Княства Літоўскага. Кніга захоўвалася ў супрасльскім Дабравешчанскім манастыры (заснаваны ў 1498 г. у г. Супрасль, Польшча), у канцы XIX ст. знаходзілася ў зборах Віленскай публічнай бібліятэкі.

На выставе прадстаўлены і самы старажытны рукапіс, які ёсць у зборы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Гэта «Адкрывальнік ісціны суны» – тлумачэнні на зборнік хадзісаў «Ніша свяцільнікаў». Хадзіс – гэта паданне аб словах і дзеяннях прарока Мухамада. З хадзісаў складаецца Суна – святы тэкст мусульман. Дата стварэння рукапісу – 1377 г. Перапісчык – Абдульгафар аль-Гіфары. Тэкст напісаны на арабскай мове дробным почыркам у каліграфічным стылі «насх». Рукапіс мае прыгожае мастацкае аздабленне. Асобнік паходзіць з гомельскай калекцыі графа Ф. Паскевіча.

У пяцёрку рукапісаў «5 + 5 + 5» увайшла і індыйская кніга-потхі на пальмавых лістах. Напісана на санскрыце. Дакумент выраблены ў XIX ст., але па старажытнай тэхналогіі. Пальмавыя лісты адмысловым чынам апрацаваны і адпаліраваны. Надпісы нанесены

з двух бакоў ліста завостраным стрыжнем. Лісты звязаны ў адзін стос праз прабітую адтуліну скураным шнуром, зверху і знізу стоса лістоў прымацаваны дошчачкі-вокладкі. У кнізе-потхі выкладзена традыцыйная сістэма індыйскай народнай медыцыны – Аюрведа.

Скрутак паморскі стараверскі (XIX ст.) завяршае прадстаўнічую пяцёрку рукапісаў выставы. Ён адзіны прыклад надзвычай каштоўнага і рэдкага пісьмовага помніка стараверскай культуры ў зборы бібліятэкі. Скрутак утрымлівае шэсць твораў-павучанняў, мэта якіх – доказ сапраўднасці стараверскіх поглядаў на форму крыжа, пальцаскладанне, царкву, наступленне часоў Апакаліпсіса («канца свету»). Даўжыня скрутка – 11 м 70 см. Рукапіс аздоблены застаўкамі-рамкамі, ініцыяламі і 12 малюнкамі, дапасаванымі да зместу тэксту. Згодна з легендай, скрутак пэўны час бытаваў у асяродку старавераў Сібіры, Браншчыны і Гомельшчыны. Быў набыты ў фонд бібліятэкі ў прыватнай асобы ў 1997 г.

Другая пяцёрка – стардрукаваныя кнігі. Кожная з іх – знакавы паасобнік для беларускай культуры.

Кнігі нашага першадрукара Францішка Скарыны. Прадстаўлены пражскія выданні – кнігі Царстваў (1518), комплекс з чатырох кніг Старога Запавету, у якіх выкладзена гісторыя Ізраільска-Іўдзейскай дзяржавы. Кожная кніга мае самастойную прадмову і пасляслоўе выдаўца на старажытнабеларускай мове. Шрыфт выданняў Скарыны вылучаецца дасканаласцю. Усе чатыры кнігі маюць тытульны аркуш з гравюрай. Кнігі Царстваў былі набыты ў 1925 г. у ленінградскага бібліяфіла У.І. Камарніцкага.

Дэманструецца асобнік з самай каштоўнай калекцыі стардрукаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі – інкунабул (выданняў XV ст.). Гэта гербарый надрукаваны ў Майнцы ў 1484 г. Петэрам Шоферам, які пачынаў працаваць з першадрукаром Іаганам Гутэнбергам. Экзэмпляр мае пераплёт XVI ст.: скура на дошках. Ён утрымлівае 148 контурных гравюр раслін, якія дапоўнены тлумачальным тэкстам аб іх лекавых якасцях. Асобнік паходзіць са знакамітага нясвіжскага кнігазбору Радзівілаў.

Адметнае Евангелле (1575) – першае і адно з найбольш дасканалых выданняў віленскай друкарні Мамонічаў змешчана на выставе. Друкарская праца Пятра Мсціслаўца. Евангелле выдадзена фарматам у адзін аркуш і надрукавана буйным выразным шрыфтам, які потым стаў узорам для так званых евангельскіх шрыфтоў. Набор вызначаецца высокай дакладнасцю і тэхнічнай бездакорнасцю. Чатыры гравюры евангелістаў выкананы ў асаблівым стылі фігурных выяў, якія адыгралі значную ролю ў далейшым развіцці кніжнай гравюры. Выданне было набыта ў фонд бібліятэкі ў прыватнай асобы ў 2001 г.

У пяцёрку стардрукаў «5 + 5 + 5» увайшло першае прыжыццёвае выданне трактата «Вялікае мастацтва артылерыі» Казіміра Семяновіча (1600–1651) – нашага суайчынніка, ваеннага інжынера і тэарэтыка артылерыі, аднаго з заснавальнікаў сусветнай ракетнай балістыкі і касманаўтыкі. Манаграфія, напісаная на лацінскай мове, складаецца з пяці частак і ўключае гравюры з 206 малюнкамі, выкананымі па эскізах аўтара. Даследаванне было перакладзена на шматлікія еўрапейскія мовы. На працягу стагоддзяў гэты твор з'яўляўся не толькі адной з найважнейшых у Еўропе навуковых прац, але і вельмі запатрабаваным падручнікам па артылерыі. Выданне набыта пры падтрымцы ААТ «БПС-Сбербанк» у 2012 г.

Дэманструецца «Хроніка Еўрапейскай Сарматыі» – адна з першых друкаваных гісторый беларускіх зямель. Аўтар твора вайсковец і гісторык, італьянец па паходжанні Аляксандр Гваньіні (1534–1614). Быў камендантам Віцебска, займаўся ўмацаваннем абарончых пабудоў. З'яўляўся сведкам шматлікіх падзей, апісаных у кнізе. Першае польскамоўнае выданне «Хронікі...» (Кракаў, 1611, друкарня М. Лоба) было шырока распаўсюджана на тэрыторыі беларускіх зямель. Яно складаецца з 10 частак-кніг, якія маюць



асобныя тытульныя лісты і прадмову аўтара з прысвячэннем. Выданне багата ілюстравана і ўключае гравюры гербаў, князёў, гарадоў, батальных сцэн, а таксама партрэт і герб аўтара. «Хроніка...» была запатрабаваным выданнем, знаходзілася ў бібліятэках магнатаў і шляхты. Экзэмпляр са збору Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў.

Пяцёрка рэдкіх кніг уключае выданне з дароўным надпісам адметнага беларускага пісьменніка Максім Багдановіч (1891–1917). Аўтограф паэта на тытульным лісце «Вянка» – першага і адзінага прыжыццёвага зборніка выбраных вершаў (Вільня, друкарня М. Кухты, 1913) накладам у 2000 асобнікаў. Кніга падпісана яраслаўскаму сябру па гімназіі Мікалаю Рафаілавічу Какуеву. Максім Багдановіч быў закаханы ў сястру Мікалая Ганну Какуеву. Паэт прысвяціў ёй шэраг твораў. Прадстаўлены асобнік «Вянка» быў дасланы бібліёграфу Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, даследчыцы спадчыны М. Багдановіча Ніне Барысаўне Ватацы ў 1971 г. з Ленінграда. Каштоўны падарунак зрабіў Мікалай Іванавіч Лілееў – сын Ганны Какуевай.

На выставе можна знайсці і аўтограф Марка Шагала (1887–1985) – аднаго з самых знакамітых прадстаўнікоў мастацкага авангарда XX ст. Дароўны надпіс змешчаны ў выданні «Marc Chagal», якое з'яўляецца першым даследаваннем творчасці мастака, надрукаваным у Парыжы. Кніга выйшла ў выдавецтве «Галімар» у серыі «Новыя французскія мастакі» з уступным артыкулам мастацтвазнаўцы Вальдэмара Жоржа, яна утрымлівае 29 рэпрадукцый прац М. Шагала. Аўтограф «Pour mon ami Fels / Chagall» («Моему другу Фельсу / Шагал») адрасаваны крытыку Фларыяну Фельсу (1891–1977), які з'яўляўся прыхільнікам новых авангардных кірункаў у мастацтве.

Рарытэтная арт-кніга «Прыпавесці да 12 акварэляў Лу Альберт-Лазар» стала сапраўднай перлінай экспазіцыі пяцёркі рэдкіх кніг. Яе аўтары французскі пісьменнік Поль Валеры (сёлета святкуецца 150-годдзе з дня нараджэння) і мастачка экспрэсіяністка Лу Альберт-Лазар. Арт-кніга ў выглядзе альбома выйшла тыражом 300 экзэмпляраў. Складаецца з паасобных аркушаў, складзеных у кардонную папку. Асобнік № 43 выкананы на адмысловай паперы фабрыкі Відалон. Ілюстрацыі (12 акварэляў) узноўлены на тонкай празрыстай паперы фотамеханічным спосабам (геліятыпія). На тытульным лісце – аўтограф мастачкі.

У пяцёрку рэдкіх кніг «5 + 5 + 5» увайшоў мініяцюрны ілюстраваны кішэнны каляндар на 1854 г. Традыцыйны нямецкі кішэнны каляндар (сумка-каляндар), выдадзены ў Мюнхене. Памер 85x50 мм. Акрамя каляндарнай сеткі з астранамічнымі данымі ўтрымлівае пералік памятных дат на кожны месяц. Аздоблены каляровымі гравюрамі з цытатамі, якія з'яўляюцца ілюстрацыямі да літаратурных твораў, надзвычай папулярных сярод нямецкай грамадскасці XIX ст. Першая група прысвечана кананічнаму вершу нямецкай літаратуры «Песня звона» Фрыдрыха Шылера. Другая – ілюструе раман амерыканскай пісьменніцы Гарыет Бічэр-Стоў «Хаціна дзядзькі Тома». Экзэмпляр мае скураны пераплёт з клапанам. Выданне камплектавалася алоўкам для зручнасці карыстання і магчымасці рабіць запісы. Аб гэтым сведчыць прадаўгаватая кішэня-адтуліна ўнутры пераплёту. Аловак адсутнічае. На апошніх чыстых старонках календара, запланаваных для нататак, ёсць запісы простым алоўкам. Пераплёт аздоблены цісненнем золатам. Мае залаты абрэз.

Зборнік беларускай паэзіі, які існуе ў свеце толькі ў адным экзэмпляры, стаў апошнім з 15 рарытэтаў, змешчаных на юбілейнай выставе. Уяўляе сабой сувенірную мініяцюрную кнігу. Выдадзены ў 1 экзэмпляры (Мінск, 1999) па ініцыятыве рэспубліканскага літаратурна-мастацкага фонду «Гронка». 1999. Памер выдання 100x65 мм. Мае адмысловы пераплёт з сіняга аксаміту на кардоне, упрыгожаны ажурнымі філіграннымі накладкамі. Зборнік складаецца з трох раздзелаў, якія ўключаюць вершы трох паэтаў: Сяргея Законнікава, Анатоля Зэкава, Алеся Пісьмянкова. На пачатку кожнага раздзела ёсць дароўныя надпісы аўтараў: «Жадаю шчасця! Сяргей Законнікаў»; «Пад ветразем кахання – да сэрцаў яднання! Ан. Зэкаў»; «Няхай Вам скрыюць зоры! Алесь Пісьмянкоў».

Выстава была падрыхтавана намаганнямі супрацоўнікаў сектара музейнай дзейнасці: Т. Захарава (ідэя, адбор экспанатаў), В. Сінькевіч (дызайн экспазіцыйных комплексаў), Н. Рэдзька (дызайн афішы і анатацыйных матэрыялаў).

Выстава «5 + 5 + 5» будзе працаваць у Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі да 24 кастрычніка 2021 г.

**Summary**

The author reveals the secrets of the jubilee exhibition "5 + 5 + 5", timed to coincide with the 15th anniversary of the Book Museum of the National Library of Belarus.